**Стандарты для дасягнення Мэт устойлівага развіцця**
Наша «Агульнае бачанне для лепшага свету»

**Пасланне да Сусветнага дня стандартызацыі – 2021**

Мэты ўстойлівага развіцця (МУР), якія накіраваны на ліквідаванне сацыяльнай няроўнасці, развіццё ўстойлівай эканомікі і зніжэнне тэмпаў змены клімату, з'яўляюцца вельмі амбіцыйнымі. Іх дасягненне патрабуе супрацоўніцтва дзяржаўных і прыватных партнёраў, а таксама выкарыстання ўсіх даступных інструментаў, уключаючы міжнародныя стандарты і ацэнку адпаведнасці.

Інтэнсіўная барацьба з бесперапыннай глабальнай пандэміяй паказала надзённую неабходнасць комплекснага падыходу да дасягнення МУР, каб умацаваць наша грамадства, зрабіць яго больш устойлівым і справядлівым. Сёння мы просім вас далучыцца да выканання нашай місіі, якая пацвярджае важнасць МУР для аднаўлення сусветнай эканомікі. У гэтых умовах стандарты актуальны як ніколі.

Уся сістэма стандартаў пабудавана на супрацоўніцтве. Гэта сведчыць аб сіле супрацоўніцтва і ўпэўненасці ў тым, што разам мы мацней. Працуючы разам, мы даём людзям рэальныя рашэнні праблем устойлівага развіцця.

Менавіта з гэтай мэтай на працягу многіх гадоў мы праводзім Сусветны дзень стандартызацыі, дэманструючы мноства спосабаў, як міжнародныя стандарты спрыяюць паспяховаму дасягненню МУР. Мы адзіныя ў сумеснай рабоце над паскарэннем рэалізацыі Парадку дня – 2030, выкарыстоўваючы стандарты і наша «Агульнае бачанне для лепшага свету».

**Іньбяо ШУ**, Прэзідэнт IEC
**Эдзі НЬЁРОГЕ**, Прэзідэнт ISO
**Хоўлін ЧЖАО**, Генеральны сакратар ITU